Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка

# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2013 г.

## Мерапрыемствы да Тыдню роднай мовы

12 лютага

Гадзіна роднай мовы "Беларусам нельга звацца, калі роднай мовы цурацца". У мерапрыемстве прымалі ўдзел вучні 5-7 класаў. Была прадстаўлена выстава "Традыцыйныя рамёствы беларусаў", прадэманстраваны народны беларускі касцюм. Бібліятэкары падрыхтавалі медыявіктарыну "Што ты ведаеш аб Радзіме?", правялі конкурс "Загадкі і прымаўкі беларусаў".

*Дывінская ДБ, 14 чал.*

18 лютага

У рамках Тыдня роднай мовы 18,19 і 20 лютага ў Кобрынскай дзіцячай бібліятэцы прайшло свята беларускай казкі “Казка родная, народная”. Для вучняў трэціх і чацвёртых класаў СШ №8 бібліятэкары падрыхтавалі інсцэніроўку беларускай народнай казкі “Лёгкі хлеб”, віктарыну – эстафету “Казкі водзяць карагод” і прэзентацыю кніжнай выставы “Да нас у госці казка завітала”.

*ДБ, 53 чал.*

19 лютага

Лукская сельская бібліятэка сумесна з СДК правяла літаратурна – музычную кампазіцыю “Багата, родная ты мова…”. Прагучалі вершы, прысвечаныя нашай мове і запісы беларускіх песен. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава “Слова роднае – вечнасці след” і конкурс загадак “Знаўцы роднай мовы”.

*Лукская СБ, 15 чал.*

20 лютага

Літаратурная вечарына “Слова роднае-вечнасці след”, якую правяла бібліятэкар сумесна з супрацоўнікамі Батчынскага СДК. Удзельнікі вечарыны расказвалі вершы, адгадвалі загадкі, імправізавалі прыказкі, інсцэніравалі казку. Гучалі беларускія песні ў выкананні Захарчука Сяргея, студэнта-практыканта Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

*Батчынская СБ, 17 чал.*

21  лютага

Свята роднай мовы "Чароўнае святло беларускай мовы". Удзельнікі сустрэчы, вучні 3 класа, чыталі вершы на беларускай мове, адгадвалі загадкі і ўдзельнічалі ў віктарыне "Беларуская казка - казка родная, народная".  Былі падрыхтаваны  2 выставы: "Якое хараство гэтыя казкі" і  "Затрымайся на хвілінку - пачытай навінку".

*Гарадзецкая СБ, 14 чал.*

21 лютага

Адбылося выступленне ЛПГ "Рытм" "Беларускай мовы рысы непаўторныя". Удзельнікамі мерапрыемства сталі навучэнцы ГПТК будаўнікоў. Прагучала літаратурна-музычная кампазіцыя са слайдпрэзентацыяй. Загадваліся загадкі, юнакі працягвалі прыказкі і прымаўкі, якія пачынаў бібліятэкар.

*ЦБ, 25 чал.*

**<u>Мерапрыемствы да Дня абаронцаў айчыны і Узброенных сіл РБ</u>**

**<u>І да Дня памяцi воінаў-інтэрнацыяналістаў</u>**

13 лютага

Адбылася сустрэча з воінамі-інтэрнацыяналістамі “Няхай пакаленні ведаюць”. Прысутным  прапанавана кніжная выстава “Афганистан: без грифа “секретно””, літаратурнае выступленне клуба “Брыганціна”, чытанне вершаў вучнямі 10-11 класаў “Матерям афганцев…”

*Гарадзецкая СБ, 50 чал.*

14 лютага

Урок мужнасці «Па дарогах Афганскай вайны», прысвечаны 25-годдзю вываду войскаў з Афганістана. На сустрэчы прысутнічаў Андреюк Іосіф Браніслававіч, падпалкоўнік, нам. камандзіра асобнага батальёна аховы ў Афганістане. Іосіф Браніслававіч расказаў навучэнцам 5 «А» і 5 «Б» класаў СШ № 1 сваю непаўторную гісторыю, а ў цэлым - гэта была ажыўлёная гутарка аб гісторыі Савецкага Саюза, яго гераічныя старонкі.

*ДБ, 20 чал.*

20 лютага

Агляд літаратуры “ Наша армія – гонар і слава”.Прадстаўлены  творы пра абаронцаў Радзімы, героях Вялікай Айчыннай вайны, выбарка з перыядычных выданняў пра ўзброенныя сілы Рэспублікі Беларусь.

*Патрыкаўская СБ, 17 чал.*

22 лютага

Дзіцячай агідбрыгадай была праведзена акцыя “Не забыты ветэраны”. У ходзе акцыі ўдзельнікі наведвалі ветэранаў на даму і віншавалі са святам абаронцаў Айчыны.

*Тэвельская СБ, 7 чал.*

**Іншыя мерапрыемствы**

10 лютага

Гарадзецкая СБ разам з Гарадзецкім СК , Аніскові́цкім ДК и Гарадецкай сярэдней сад-школай правялі мерапрыемства "Запрашаем на вячоркі", прысвечанае Году гасціннасці. У цікавай тэатралізаванай праграме вечара прыняли ўдзел вучні Гарадзецкай СШ, група "Алёнка" Гарадзецкага СК и фальклорны калектыў Аніскавіцкага ДК, якія парадавалі гледачоў вясёлымі музычнымі нумарамі. Гасцям "вячорак" спадабалася прымаць удзел у конкурсах "Хуткавымаўлянкі маёй суседкі", "Прыказкі маёй бабулі", "Загадкі ад дзядулі", а таксама гледачам давялося паўдзельнічаць ў народных танцах.

*Гарадзецкая СБ, 56 чал.*

11 лютага

У дзіцячай бібліятэцы адбылося пасяджэнне аматарскага клуба «Светлячок» - «Бианки – лесной кудесник» (да120-годдзя з дня нараджэння рускага пісьменніка – натураліста В.Біанкі).

*ДБ, 15 чал.*

13 лютага

Залеская і Закросніцкая сельскія бібліятэкі сумесна са школай і СДК правялі мерапрыемства , прысвечанае 100- годдзю А.Куляшова « І вечнасць Радка , як вечнасць жыцця" . Прысутныя прайшлі творчымі сцежкамі паэта . Навучэнцаў пазнаёмілі з лепшымі творамі А. Куляшова. Да мерапрыемства была падрыхтавана электронная прэзентацыя і кніжная выстава «Ён наш паэт , ен наша слава".

*Залесская СБ, Закросніцкая СБ, 23 чал.*

15 лютага

Прайшоў музычна-паэтычны вечар “Усё пачынаецца з кахання”.У праграме гучалі вершы А. Ахматавай, музычныя віншаванні, праводзіліся конкурсы.

*Магдалінская СБ, 15 чал.*

**Выдавецкая дзейнасць**

База сцэнарных матэрыялаў к 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў “И память о войне нам книги оживляют”.

Цэнтральная бібліятэка,

аддзел бібліятэчнага маркетынгу

Паўнатэкставая база сцэнарных матэрыялаў "Беларускай мовы рысы непаўторныя".

Цэнтральная бібліятэка,

аддзел бібліятэчнага маркетынгу

Краязнаўча-бібліяграфічны каляндар “Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны”.

Цэнтральная бібліятэка,

Бібліёграфы

Інфармацыйна-метадычны зборнік "Гостеприимство в библиотечном переплете".

Цэнтральная бібліятэка,

аддзел бібліятэчнага маркетынгу

Рэкамендацыйны спіс сцэнарных матэрыялаў «Ад юбілея, да юбілея».

Цэнтральная бібліятэка,

аддзел бібліятэчнага маркетынгу